Над старадаунаю сталіцаю Гэдыміна павяваяцца цяпер чырвоны сьцяг інтэрнацыянальнаго соцыялізму. Літоуская Тарыба, праз увесь час нямецкай оккупацыі самазванна выступаушая ад імяні літоускаго народу, разам са сваімі міністрамі уцякла у Коуню. Усяго на адзін месяц пяражыла яна сваю сястру—Беларускую Раду. Доля іх вельмі паходзіць адна на другую. Як і нябошчыца Беларуская Рада,—Тарыба ніколі ня была прадстауніцаю інтарэсау працоуных масс. Літоускі працоуны народ і Тарыба увесь час жылі кожны сваім асобным жыццём: літоускія сяляня стагналі под цяжкім уціском нямецкіх захопнікау і ад усяе душы праклінали крывавага Вільгэльма разам з яго гэнэраламі, у той час як Тарыба дзякавала ім за збавення краю ад маскоускаго папавання. Адгэтуль зусім зразумела, што працоуныя масы літоускаго народу ніколі ня мелі сымпатыі да Тарыбы. Яна жыла і працавала ня толькі што ня у згодзя з інтарэсамі таго народу, ад імяні якога яна выступала, але проста напопярак ім. Дзеля гэтаго яна пя мела і ня магла мець якога-б то ні было, падтрымання у краю; ядынаю яе падпораю і аховаю былі нямецкія багнэты. Посьля таго, як гэтая падпора была выбіта з пад яе нямецкаю равалюцыяю, стала ясна, што нядоуга засталося іой жыць на сьвеця. Пробавала Тарыба замяніць нямецкія багнэты ангельскімі і французкімі і пасылала дэлягацыі да заходня-эурапейскіх імпэрыялістау, але надарэмна. Францыя і Англія зусім ня зацікауляны у падтрыманні Тарыбы і ня могуць траціць сваіх салдат і свае грошы толькі дзеля гэтае адная мэты. Пацярпеушы няудачу у сваіх хадайніцтвах, Тарыба дакладала усіх старанняу, каб згуртаваць сваю уласную армію. Вялося самая старэнная заклікання літоускіх сялян у шэрэнгі „нацыянальнае арміі", але у адказ на гэта літоускі народ толькі глуха маучау. За тоя на прызыу Тарыбы з вялікаю ахвотаю адазваліся быушыя гэнэралы і ахвіцэры царскай арміі, вый шаушыя з панскаго роду. Гэтаго дабра Тарыба набрала нават больш, чым іой трэба было. Усе штабы, упраулення, камандзіры усіх часьцей войск, пачынаючы ад роты і канчаючы арміяй, былі напагатовя; ня хапала толькі салдат.

Пры падходзя чырвонае арміі пад Вільню, Тарыбя толькі і заставалася зпажыць свае манаткі ды вымятацца куды-небудзь даляй.

Хаця Тарыба і абвяшчая, што у Коуні яна будзя даляй вясьці сваю працу, але дзень забрання Вільні чырвонаю арміяю, фактычна быу днiом яе сьмерці. Надта ужо вачавідна паказау іон усю адзінокасьць Тарыбы, адарваннасьць яе ад жыцця і няпатрэбнасьць яе істнення.

Павал Любецкі.

Равалюцыйная праца на Беларусі.

Ня гледзючы на тоя, што Беларусь ва усе часы, аж дагэтуль была пакіну тым, глухім краям, усіо ж у іой заусіоды меліся патаемныя равалюцыйныя сілы, ці лепш кажучы па вучонаму—потэнцыяльная энэргія равалюцыйнаго руху. Гэтая сіла толькі рэдка магла выявіць сябе, бо праз слабасць палітычнаго зразуменьня, з-за недастачы дзейных равалюцыйных цэнтрау яна ня мела магчымасці атрымаць рэзка абрысованы напрамак. Праз гэта самая і равалюцыйныя акты ня мелі на Беларусі у колішнія часы ясных мэтау і дамаганьняу і дзеля гэтаго шмат трацілі у сваіом унешнум блеску і сьвядомасці аб іх з боку чужака-паглядчыка. Але дзеля таго, хто блізка сьвядомы с беларускім жыцьцям, з настроям беларускаго селянства, хто сам жыу аднымі пытаньнямі і патрэбамі са сваімі вясковымі братамі, ведама добра, што у самых глухіх віосках, сярод самых ціомных людзей заусіоды была накіп па сэрцы супроць тае няпрауды і пагарды, якія складаліся у варунках старога парадку. Беларуская селянства—гэта паагул вялікі жабрак. Нідзе у сьвеця няма такое беднасці, убогасці усяго селянства, як на Беларусі. І побач з гэтым нідзе няма такіх вялікіх і багатых маіонткау панскіх, як у той самуй Беларусі. Рожніца у размяркаваньні дабра была тут настолькі відавочнаю, што самы дурны ці забіты чалавек мог прыкмеціць яе. Вось гэтая беднасць агулам усяго селянства і падтрымоувала у ім усягдашняя нязадавольства і складала атмасфэру равалюцыйнасці. І калі равалюцыйнасць беларускага селянства ня мела ясных абрысау, то пачуцьціо ака намічна палітычнаго звароту, пяясная жаданьня вольнасці глыбока трымалася у душы і сэрцы селяніна, чакаючы толькі пабочнае сілы, якая-б зрабіла штурх і дала-б напрамак драмаушым сілам, пададзьмула б захованую у попяля іскру равалюцыйнаго агню.

Як толькі ушчауплася на Расеі равалюцыя у 1917 годзя, Беларусь ачнулася і пачала равалюцыйную працу па узбудовя новаго палітычнаго быцьця. Ня маглі задушыць гэтае працы і тыя злыдныя трапункі, як наступ немцау. Ня ледзючы на няймаверны уціск, на ка гаваньня прыхільнікау равалюцыі, беларускі працоуны народ ня пакідау думкі аб сваіой вольнасці і дамаганьні свайго арава на жыцьціо. На усей Беларусі у часы акупацыі ішла равалюцыйная праца, чарыхтованая па большасці к вызваленьню ад нямецка-польскаго прыгнопу, ня трэба маліць равалюцыйных заслугау нашага селянства: той хуткі поступ чырвонае арміі ад Воршы да Мінску, ад Мінску да Ліды і Вільні і цяпер даляй на Гродню у значнуй меры залежыць ад падмогі тых партызанскіх атрадау, якія зложаны з мейсцоваго селянства. Трэба толькі падтрымаць яго, паслаушы на падмогу большыя вайсковыя сілы. Прачытайця павядамленьня прадсядацяля Ваеннаго Савету паустанчаскіх камуністскіх атрадау Ільіна, і вы пабачыця, якую працу нясе селянства Беларусі у равалюцыі і чаго яму трэба.

Толькі з другога боку—з боку умацаваньня сацыяльнага устрою патрэбна цяжкая і пільная праца сярод селянства на Беларусі. Равалюцыя зрабіла такі зварот у жыцьці, паставіла сабе такія шырокія і вялікія мэты, што нават крыху сьвядомыя у палітычных пытаньнях людзі ніяк ня могуць прыпасавацца к новаму грамадзянскаму устрою. Што ж можна казаць аб той вагромністуй аграмадзя ціомнага селянства, якоя толькі жыло пачуцьціом, вобмацкам, чуючы на сабе толькі здзек старога устрою і ня маючы ясна абрысованых сваіх уласных мэтау і задачау пасля равалюцыі? А тым часам, равалюцыя дзеля свайго умацаваньня трэбуя самадзейнасці, сьвядомасці у астатніх мэтах, распаусюжаньня ідэяу ве сярод усяго працоунаго народу. Дзеля гэтаго кожнаму зразумеламу камуністу, сбаючиму аб пашырэньні равалюцыі, належыць далажыць увесь пэнт па асьвеця дярод беларускаго селянства мэтау і задачау сацыяльнае равалюцыі, памятаючы, што Беларусь з'яуляцца ты плацдармам яе, атвуль яна павлядзе барацьбу з заходняю буржуазіяй і які будзя вытрымліваць на сабе усе нападкі міжнароднаго грашауніцтва і імпэрыялізму. Чымся мацнейшым будзя гэты плацдарм, чымся больш будзя іон мець ваіоунікау за сацыялізм, чымся вышэй будзя у іх равалюцыйны настрой і сьвядомасць у мэтах і задачах равалюцыі, тым удзячнай і хуччэй апошняя будзя пашырацца і умацоувацца на Польшчы, Ліцьве і даляй на заход.

Правіцельства Беларускае Радавае Рэспублікі, зложаная толькі с камуністау, вядома, даложыць усіо сваіо стараньня, каб перш усяго пашырыць сярод селянства сацыяльную сьвядомасць, паказаць яму, як і дзеля чаго патрэбна сучасная барацьба са усімі ворагамі равалюцыі. Калі Ураду нашаму удасца умацаваць у селянскіх аграмадах ідэі і астатпія мэты сацыяльнае равалюцыі, то іон выпауніць адну з важнейшых сваіх задачау.

Петровіч.

Патрэбнасць палітычнаго зразуменьня.

Равалюцыя па свайму закладнаму сэнсу іосць такі рух грамадзянства, які мая сваею мэтаю абураньня абрыдаушаго, аджыушаго палітычнаго устрою і установу іншаго складу жыцьця і управы на закладзінах тых поглядау і патрэбау, якія адказваюць момэнту і жаданьню народу. Такім кшталтам у равалюцыі трэба разглядаць два розныя тэрміны: першы—абураньня і скасаваньня старога парадку, старых установау, і другі ствараньня новых, іншых грамадзянскіх адносін і інстытуцыяу. У абудвых гэтых тэрмінах равалюцыі дзейнасць прыналежыць дзвіом рознаго характару сілам: адною сілаю з'яуляяцца творчая ініцыатыва некульлкіх асобау, якія складаюць тэаратычная навучэньня, вядуць ідэйную барацьбу с старым урадам, сеюць у народныя аграмады думкі аб звароця у бок абураньня шкадліваго дзеля працоунікау парадку; другая сіла—пассіуная, якая ня складая і ня выяуляя сваіх думак, але толькі падхапляя іх выраблянымі палітычнымі правадырамі, ставіць іх мэтамі свайго палітычнаго дамаганьня, і як толькі гэтыя думкі аўладаюць значнаю часткаю гэтае сілы, яна сваімі рукамі выпауняя першы тэрмін равалюцыі—зьніштажэньня старога парадку. Вядома, што разам з думкаю аб абураньні старога устрою творчая сіла равалюцыі вырабляя і пляны будучаго новаго устрою і ставіць мэты новых дамаганьняу. Іначай, равалюцыя ня мела б пад сабою цьвердаго грунту, была б няяснаю і праз гэта нямагчымаю. Першы тэрмін равалюцыі і скончваяцца абураньням старога парадку дзеля умацаваньня замест яго новаго, які адказвау бы жаданьням грамадзянства, ахвармованым творчымі сіламі і які быу бы далейшым крокам у напрамку люцкаго роду да сьветлых яго ідэалау у будучыня.

Даляй пачынаяцца другі тэрмін равалюцыі—умацаваньня у жыцьці тых думак, якія былі выстауляны мэтамі равалюцыі. Творчыя сілы яе становяцца паверху і дамагаюцца дадаць сваім думкам цела, залажыць у стасунку з імі новы грамадзянскі і палітычны устрой, прыпасаваць яго так, каб іон меу моцны грунт пад сабою і служыу бы дзеля будучыны надзейнаю закладзінаю. Тутака прыходзіцца лічыцца ужо с трэцьцяю сілаю, якая сусім ня мела прыхільнасці да равалюцыі і была толькі сьведкаю звароту. Гэтая сіла—нясхвармованая аграмада народу, сярод якое ідэі равалюцыі наупярад ня мелі прыкладнасці; гэтая сіла нават пассыуна ня схілялася да равалюцыі, і яе падмогу у равалюцыі можна лічыць толькі такою, што яна ня рабіла пярашкодау равалюцыйнаму руху. Ня будучы сьвядома у равалюцыі, цікаулючыся апошняю толькі, як аб'ектам, гэтая склізістая нясхвармованая аграмада народу, ня шкодзячы равалюцыі у першы яе тэрмін, можа шмат пансаваць яе у другі.

Справа у тым, што змена грамадзянскаго, палітычнаго і аканамічнаго устрою праз равалюцыю дадае усяму укладу жыцьця стромы зварот, ломіць колішнія звычайкі, загастрая аканамічныя адносіны, робіць часовую нядастачу у харчу, парушая грашавыя справы і інш. Так ці інакай варункі звароту зачапляюць кожнаго, адказваючы адным жаданьням яго і ідучы супроць іншых. І гэтая бяздзейная, нясхвармованая аграмада, жывучы толькі патрэбамі сягодняшняго дню, ня бачучы упярадзя астатніх мэтау равалюцыі, ня будучы з імі нават знаіома, ня кажучы ужо аб пражэньні да іх, такая аграмада ропча, ня верыцъ; яна ці маучыць, бытцам нічога ня разумеючы, ці помстуя, калі патрэбуюцца ад яе якія-небудзь патраты на справы равалюцыі. Паміж творчымі сіламі равалюцыі і гэтаю пассыунаю аграмадаю уздымаяцца сьцяна, якая ня дазваляя адной разумець другую. Такоя раздзяленьня, няразуменьня мая вялікую пагрозу равалюцыі, бо у той час, як творчая сіла ідзе простым напрамкам да пастауляная сабе мэты, тыя сілы, дзеля якіх равалюцыя і рабілася, стаяць у нявядомум мейсцы, у чыстум полі між дзвіох дарогау, з якіх адна вядзе назад да старога, а другая упярад да новаго. І вагромністая сіла таучэцца на мейсцы, між гэтых дарогау: куды, на якую дарогу яна пападзе—нявядама іой самой.

У нашуй сацыяльнуй равалюцыі гэтая інэртная сіла, ня кажучы ужо нічога аб сьвядомых дзейных контар-равалюцыянерах, робіць шмат прыпынкау пашырэньню і умацаваньню у жыцьці мэтау сацыялізму. На барацьбу, барацьбу асьветна—ідэйную, з гэтаю сілаю павінна быць нядадкладна звернута належачая увага творчых сілау равалюцыі. Апошнія павінны прагчыся да таго, каб падняць разуменьня шырокімі аграмадамі народу мэтау сацыяльнае равалюцыі на тую вышыню, на якой стаяць самі стварыцялі равалюцыі. Мала таго, трэба дамагчыся, каб гэтая разуменьня ня было толькі халоднаю, аб'ектыунаю сьвядомасцю у палітычных і аканамічных справах і мэтах равалюцыі, але каб яно увайшло у сэрца аграмадау працоунаго народу, запаліла яго вагніом пражэньня, равалюцыйным пэнтам. Увесь працоуны народ павінян мець у сабе пачуцьціо сацыялізму і патрэбу у іом, як у хлебя ці вадзе. Сацыялізм павінян зрабіцца яго новаю вераю, вольнасць яго няатымнаю патрэбаю, самадзейнасць і творчасць працы—імпульсам яго вольнае душы, а ня послядам прыгону ці скацячаго пачуцьця. Вось, чымся хуччэй увесь працоуны народ будзя захоцляны гэтым вялікім разуменьням, тым барджэй на зямлі васпануя сацыялізм, які ужо шмат прайшоу па дорозя славы і адоляньня ціомнаго царства прыгону.

Неманскі.

Беларусізацыя школау Беларускай Камуны.

Гэткая запатрэбаваньня была выстауляна вучнямі Горэцкіх сельска-гаспадарскіх навуковых інстытуцый першым пунктам наказу дэлэгату на 2-і Заходня-Краёвы зьезд прэдстаунікоу вучніоускіх арганізацый школау другой прыступкі. Прауда, зьезд гэты дзеля прыкраго няпаразумення ня быу скончаны і у зьвязку з гэтым пытаньня аб часьціннай беларусізацыі пя разглядалася, але самы факт выстауленьня такой запатрэбы надта цікавы і прымушая троху над ім застанавіцца.

Кожны народ, кожная нацыя, якая, дзякуючы дрэнна склаушымся гістарычным умовам, павінна была запепасьць на адно-два стагодзьдзя у летаргію нацыянальнаго самазабыцця, прашнуушыся, аджыушысь, з паддвоянаю энергіяю, з новаю сьвежаю сілаю бралась за адбудову свае нацыянальнае самабытнасьці, свае культуры, свайго уласнаго нацыянальнаго жыцьця. Родная мова у некатарых урадавых інстытуцыях, родная школа,—вось этапы культурна-нацыянальнаго адраджэння занянаушых. „адсталых" нацый. Апошняя запатрэбаванняродная школа—выстауляляся кожным з народау, гісторыя адраджэння каторых прайшла прад вачыма людзей XIX і пачатку XX стагодзьдзя. Змагання за родную школу чэхау, краатау, славакау, баугарау, сэрбау і нашых бліжэйшых па духу і долі братоу-украінцау займая асобная пачэсная мейсца у гісторыі культурнаго адраджэння гэтых народау. Агітацыю за „украінізацыю", а потым рэальныя відавочныя крові на гэтум шляху украінцам прышлося вясьці на працягу больш, чым двух дзесяткау гадоу. І толькі цяпер, калі Украіна пасьпела ужо пабыць „нязалежнаго, самасьційнаю дзяржаваю", калі ніхто ужо ня перашкаджая украінскаму народу у яго культурна-нацыянальнум разьвіцці,—толькі цяпер с пэунасцю можна сказаць, што украінцы дабіліся роднае, украінскае школы.

Нам, беларусам, як маладому, нядауна выйшаушаму з-пад нацыянальнаго царска-вялікарускаго прыгняцення, народу,—народу, які толькі пачау тварыць, ці справядлівей,—аджыуляць сваю уласную культуру, і трэба зьвярнуць асабліную увагу на нашу школу.

Трэба ведаць і заусягды памятаць, што родная школа—гэта тая брама, тыя вароты, праз каторыя ляжыць простая дарога, шырокі, кветкамі усыпаны шлях да жывой, ня высыхаючай крыніцы роднае, а праз то і усясьветнае культуры; трэба ведаць, што па гэтаму і толькі па гэтаму шляху павінны мы, беларусы, павесьці сваіх дзетак, а някаторыя і пайсьці самі. Без беларускае школы, ніжэйшае і вышэйшае, беларускі рух, рух культурны, прымушаны будзя ісьці наперад толькі нявялікімі крокамі. Беларуская школа—гэта сьвяты купальскі агонь, які запаліць міліоны маладзенькіх чыстых сэрцайкау беларускай моладзі, агонь, полымя каторага ахопіць усю мертвую, кішачую чарвякамі русіфікатарскую культуру і спаліць усё гнілоя, няпатрэбная, спатрухлелая, пакінуушы толькі бурштыны чужой культуры, якія ён перахварбуя у свой родны коляр.

Змагання за школу,—гэта „апошні і рашаючы бой", які дае адраджоны народ усім пачніцам, кажанам і злыдням тае ціомнае ночы, якая, нібы пяліонкаю, агортывала народная самасазнання, якая глушыла у народзя усіо уласная, живоя, родная... Змагання за школу патрэбуя ад сваіх ваякау і прыхільнікау maximum энэргіі, maximum натугі, напружэньня, бо гэта змагання можа скончыцца толькі альбо пабедай, альбо сьмерцю.

Прайграць пабеду, адыйсьці ад намечанаго дасяганння, пакінуць школу на Беларусі такою, якою яна была—гэта значыць аннуліраваць ранейшую працу, паказаць сваю нямогу, надоуга вярнуцца назад.

А каб гэтаго ня было, каб рабіць усіо моцная, доугая, трывалая,—трэба падыходзяць да пытання аб беларусізацыі школы асьцярожна, трэба вылічыць усе рэзультаты, трэба абмяркаваць усе тыя становішчы, у якіх можа апынуцца наша школа 1-й і 2-й прыступкі і асабліва школа спацыяльная.

А што трэба зрабіць найпярвей: гэта падлічыць усе нашыя беларускія сілы, якія-б маглі узяць у свае рукі справу беларусізацыі і нагул, якія маглі-б дапамагчы гэтуй справя. А падлічыушы свае сілы, трэба іх мабілізаваць і прыступіцца да працы. А праца вялікая, бязмерна вялікая, цяжкая і упартая...

Гурык Г.

(Даляй будзя).

Ламайця згніушая!

Мы новы сьвет сабе збудуям,
У яком ня будзя крыуды, зла,
У яком людзьмі сябе пачуям,
Забудзям, гдзе бяда жыла,
 У яком ня будзя панау, хамау,
 Гдзе будзя кожны „чалавек",
 І пахаваушы сьвет абманау,
 Адчынім людзям новы век.
Будынак новы мы будуям,
Дык трэба стары разламаць,
Слупы пагніушыя з устоям
Павінны новым мейсца даць.
 Ачысьціць мейсца мы павінны,
 Зьмясьці старога усе сьляды,
 Адно тагды мы можам чынна
 Пастаць у творчыя рады.
Каб зблізіць гэты момант ясны,
Староя мусім мы ламаць,—
Без ломкі стараго ня уластны
Парадак новы будаваць.

Павал Каравай.

Аб усім па троху.

З Беларусі.

Телеграммы Председателю Правительства Белорусской Советской Республики.

Коллегия и сотрудники Белорусского Национального Комиссариата приветствуют в Вашем лице молодую Советскую Белорусскую Республику и выражают глубокую радость, что настал час возрождения Белорусского трудового народа.

От коллегии: Мазур.
От сотрудников: Петрович.

Московская Секция Белоруссов-Коммунистов шлет горячий привет вновь образованному Рабоче-Крестьянскому Правительству Белоруссии, желает ему успешной работы в разоренном империалистами крае и выражает глубокую [illegible]дежду, что Правительство сумеет [illegible] довые массы Бе[illegible] хищниками ми[illegible]

Предс[illegible]

От Рабоче-Крестьянского Правительства Белоруссии.

МИНСК, 11 января. Опубликована следующее постановление Временного Рабоче-Крестьянского Правительства Белоруссии: „Все изданные Правительства Р. С. Ф. С. Р. декреты, постановления и распоряжения, проведенные в жизнь местными властями в пределах Гродненской, Минской, Могилевской, Витебской и Смоленской губерниях, остаются в полной силе. Вперед все новые законы и распоряжения будут исходить от Временного Рабоче-Крестьянского Советского Правительства Белоруссии и ни один орган Советской власти не имеет права, помимо Временного Правительства Белоруссии, издавать и проводить в жизнь какие-либо распоряжения законодательного характера.

Председатель: Жилунович.
Управляющий делами: Кнорин.

Рубяжы Беларускае Радавае Распублікі.

Цэнтровым Бюро камуністау Беларусі устапоуляны рубяжы Распублікі з вось якіх губэрань: Смаленскае, Магіліоускае, Вітэбскае, Мінскае, Гродзянскае і някаторых паветау Віляпскае. Увесь гэты абшар падзеляны па сем вакругоу, замест колішніх губэрань.

Весьці Часоваго Ураду (Літвы).

29 дзякабря у Вільні выйшау № 1 часопісі „Весьці Часоваго Ураду“. Часопісь выдаецца Тарыбаю, выходзіць асобнымі выданнямі у 4-х мовах: літоускуй, беларускуй, польскуй і жыдоускуй. У часопісі надрукована дэклярацыя Часоваго Ураду. Паміж іншымі подпісамі віднеяцца подпіс „міністра без партфэлю беларускіх спрау“ — Язэпа Варонко. Другая палавіна нумару адведзяна заклікапнем да запісу самаахвотнікау у „краіовую абарону Літвы“.

Адозва Гродзянскае Беларускае Губэрнскае Управы.

1 і 2 дзякабря 1918 г. у Гродні адбыуся губэрнскі беларускі зьезд, які выбрау беларускую губэрнскую управу і даручыу іой абарону інтарэсау беларускага населення Гродзянскае губэрні. Управа уваншла у зносіны з Літоускім урадам [illegible] і з хаурусьнікамі, якія абяцаліся памагчы наладзіць правідловая жыццё краю.

У выданай ад свайго імені лістоуцы Управа заклікая гродзянскіх беларусау да самаарганізавання дзеля падмогі вяртаючымся уцякачом і дзеля адбудовы краю.

Аб будучыня Гродзяншчыны.

Адбушыся у першых лічбах дзякабра месяца Гродзянскі Губэрнскі Беларускі зьезд прыняу гэткую пастанову аб будучыня Гродзяншчыны:

„Бяручы пад увагу дамагання Польшчы на Гродзянскі край і катэгорычна адкідаючы усякую думку аб зьліянні з іою, Зьезд высказваяцца за прылучэння Гродзянскае губ. да Літвы, калі толькі іой будзя забязпечана унутраная самаурадавання, яе беларуская мова і школа“.

Беларускія павятовыя Рады у Гродзяншчыня.

З дакладау павятовых камісарау Гродзянскае губ., зробляных Радзя Міністрау (літоускіх) і Міністру беларускіх справу, відна, што у Дзятлавя, Гродні, Ваукавыску, Беластоку, Бельску і Белавежы організованы Беларускія Павятовыя Камітэты і Рады. Усе яны стаяць на грунця аутаноміі Беларусі і Літоускай дзяржаунасьці. (Веч. Телегр.).

Новая беларуская газэта.

З распараджэння Міністра беларускіх спрау у Гродні з 1-го январа пачаня выдавацца афіцыяльная газэта „Беларускі Народ“. (Веч. Телегр.).

Беларускі Совнархоз.

Урадам Беларускай Сацыялістычнай Радавай Рэспублікі арганізована Рада Народнае гаспадаркі Беларускага краю [illegible] айст), куды налічаць [illegible] установы [illegible]

Беларускі спэктакль.

(Горкі, Магілеуской губэрні).

У суботу, 7-го студня (9 дзякабра), Беларуская Сэкцыя Літэрат.-Музык.-Драматычнаго Гуртка вучняу сел.-гаспадарскіх навуковых інстытуцый давала другі Беларускі вечар-спэктакль. Пастауляна была новая драма Ф. Аляхновіча—„Манька“, у 4-х дзеях. Перед спэктаклям у пятніцу, дзеля вучняу горада Горак і ваколічных віосак была дармовая гепэральная рэпэтыцыя, па якую прышло больш паутысячы дзлучынак і хлапцоу. Хоць драма па свайму зьместу і ня падходзіла дзеля маладзенькіх слухачоу, але сцэнічныя зьявы, беларуская родная мова цікаволі іх і рабілі добрая уражэньня.

Маладыя артысты-аматоры сыйгралі нішто сабе. Шкода толькі, што некатарыя товарышы ня саусім зразумелі псіхолёгічныя асобнасьці сваіх роляу. „Міхалка“ (М. Горла), напрыклад, замест бязвольнага, мяккаго студэнта-рамантыка выявіу хітраго, бязлітаснаго цыніка-ласуна. У адной артысткі (Юлька) у мовя пракідаліся русіцызмы, якія псувалі прыгожасьць і характэрнасьць беларускай гутаркі. Добра правіо ролю студэнта-пьяніцы Леквугны Л. Дуброва; А. Сауковіч выявіла тып прыгожай, наіунай, вясковай дзяучыны „васілька“, якая толькі па ндобруй волі сваіх бацькоу напала с цікае віоскі у кіпучую вадаверць гарадзкога рэстарапу. Цікава, асабліва падканец, іграу Л. Гашыкоу (Грышка-шулер).

Посьля спэктаклю былі сьпевы. Адзін з вучняу каморніцка-аграпаміцкага вучылішча Л. Дуброва (Ляднеускі) сам пяраклау на ноты вядомыя вершы Янкі Купалы: „Гэта крык, што жыве Беларусь“, „На гэтум хітрум сьвецяе“, „Сьпі, маленьк мой сыночак“. Пад уласны акампанімэнт гітары чыстым басам іон надзвычайна пекна выпауніу гэтыя песьні-вершы. Калі іон грымеу апошпія словы—„гэта крык, гэта енк, што жыве Беларусь!“ здавалась, што сапрауды адзываецца Беларусь, дух каторой, тужлівы, сумуючы дух стогня, енчыць у зыках песьні. Адзеты беларускім хлопцом, ува усім белум, Л. Дуброва сваімі сьпевамі закінуу у душу многіх беларусау праудзівая зярнятка кахання да роднаго забітаго пароду. Была добрая дэклямацыя беларускіх вершау з твороу Якуба Коласа.

Драма „Манька“ пабудована па сацыяльна-полавых адносінах і рысуя такія маленькі жыцьця, калі сацыяльная няроунасьць крышыць і каверчыць найсьвяцейшая пачуцьцё чалавека. Яна даволі сцэнічна, мая захапліваючыя абразкі, але чыста беларускаго у іой мала. Пьеса чыстая, бяз нацыянальнаго адбітку, павінна быць западта верна псыхологічна, западта праудзіва, жыццёва. У „Маньцы“, як у гэткага роду драмя, гэтагг у іншых мястох няма. Гэта брак новаго сцэнічпа твору.

Перад Новым Годам Беларуская Сэкцыя, го якая мая ужо сваю пявялічкую трупку, думая ехаць у бліжэйшая мястэчка Раманова („Леніна“) і там наставіць дзьве пьесы: „Пашыліхя у дурні“ М. Крапіспіцкаго і „Маньку“ Ф. Аляхновіча.

Пажадаям маладым працаунікам шчасьця у пачатуй працы на карысьць Бацькаушчыны.

Гаур. Гарэцкі.

У Расеі.

Здабыткі равалюцыі.

На Заходнюм фронця чырвопая армія, пасуваючыся за адходзячымі немцамі, забрала Рыгу і Вільню. На Лідскум напрамку пашы часьці забралі Ліду і пасуваюцца на Гродню; па Баранавічскум напрамку забрана станцыя і мястэчка Баранавічы і пачауся рух у кірунку Слоніма і Бярэсьця. Польскія легіанэры псуюць дарогі, рвуць масты і пробуюць заступіць дарогу чырвопай арміі, але бязскутэчна.

На Паудніовум фронця войскам Украінскае Соцыялістычнае Распублікі забраны Харкау. Ідуць далейшыя бітвы с пятлюрауцамі.

Зьмена у настрою белае арміі.

За апошнія два тыдні мінулаго року на Ухвімскум фронця узята у палон больш як 8.000 чаловек. Солдаты белагвардейскае „народнае“ арміі выказваюць жадання разам з Радавым войскам ісьці проціу белагвардзейцау. Сярод узятых у палон заметна вялікая непавісьць да сваіх ахвіцэрау. (Роста).

Адносіны паміж Украйнай і Радавай Расеяй.

Як перадаюць кіяускія газэты, Украінская Дырэкторыя кіруецца да паразумення з Радавай Расіяй. Адбыліся нарады паміж Дырэкторыяй і большавікамі, знаходзячымися у Харкавя. На гэтых нарадах выясьнілася, што паразумення з Радавай Расіяй магчыма на гэткіх падставах: 1) Бяз'умоуная прызнання Украінскае Народнае Распублікі; у адмен за гэта Украйна прызная Радавую Распублику. 2) Поуная няумяшацяльства у хатнія справы. 3) Легалізацыя партыі бальшавікоу на Украйня і дапушчэння вольпае пропаганды бальшавіцкіх думак. 4) Скліканпя Работніцка-Сялянскаго Зьезду, дзеля разгляду пытання аб хворма уласьці.

Украінская Дырэкторыя прапануя Радавуй Распубліцы весьці далейшыя пярагаворы. Калі яны будуць ісьці удачліва,—магчыма утварэння абаронна-наступацяльнаго хаурусу Расеі і Украіны проціу расейскіх і заходніх імпэрыялістау. Дырэкторыя так сама гатова прыйсьці да паразумення з Радавай Расіяй і у пытанні аб аднауленні экапамічвых зносінау. Дзеля усяго гэтаго Дырэкторыяй будзя выслана да Масквы асобная дэлегацыя.

Украінскі Конгрэсс.

Як пішуць кіяускія газэты, Дырэкторыя склікая на 12-я январа „Конгрэсс працоунаго народу Украйны“. У склад яго павінны увайсьці 348 прадстаунікоу ад сялян, 150—ад вайсковых часьцей і 87—ад работнікау.

Белорусская школа и библиотека в Саратове.

В г. Саратове Национальным Белорусским Комиссариатом открыта трудовая школа первой ступени для детей Белоруссов, ведется работа по открытию еще одной такой же школы, но за неимением помещений таковая еще не функционирует. Коммунистической группой Белоруссов организована библиотека-читальня в одном из самых крупных общежитий, где распространяется партийная литература, а также устраиваются периодические митинги, на которых пропагандируется идея Советского строительства на Белоруссии.

Белорусы-беженцы в Саратове.

В городе в настоящее время скопилось около 40 тысяч беженцев, большинство из них Белоруссы. Вся эта беженская масса, истрадавшаяся, измученная частыми всевозможными передвижениями с одного города в другой, только и думает о том, как скорее возвратиться на старые насиженные свои гнезда, а в большинстве на пепелище этих гнезд. Характерно отметить то явление, наблюдавшееся среди беженцев, высланных белогвардейской Самарской властью из Самары в Саратов, эти массы, прибыв совершенно без ведома местной советской власти, еще в летнее теплое время категорически отказались занимать предоставляемые им помещения и оставались на берегу Волги под открытым небом, разбив свои шалаши вплоть до наступления морозов и выпада снега и многие уже переезжали санным путем, требуя немедленнаго отправления туда, откуда их выгнала царская нагайка и затеянная тем же царизмом бойня; тем самым поставили в очень трудное положение Советскую власть в их размещении и удовлетворении всем необходимым. Саратов в квартирном отношении находится в исключительном положении.

Наличие продовольственных продуктов с одной стороны и близость фронтов с другой, увеличивают наплыв все новых и новых народных масс, и Саратов уже почти не в состоянии разместить всех прибывающих. Все эти обстоятельства заставили местные власти разместить беженцев несколько скученно в недостаточно оборудованных в гигиеническом отношении помещениях, надеясь, что последнее при помощи пленбежа будет устранено сами же беженцами. Но, к сожалению, белорусский, крестьянин привыкший жить в грязи и здесь остался таковым же, не соблюдая самых элементарных необходимых гигиенических условий. От таких условий жизни появились эпидемическия заболевания и за последнее время в одном из общежитий свирепствует сыпной тиф, унося в день до 40 жертв. Борьба с этим злом при том положении, в каком находятся беженцы, почти немыслима.

Саратовец.

За рубяжом.

Англьскія работнікі проціу умяшацяльства у расейскія справы.

Агітацыя у Англіі проціу умяшацяльства у расейскія справы моцна павялічылася. Работніцкая партыя і лібэралы проціу умяшацяльства. Загатоуляна шмат літэратуры дя ангельскіх салдат на Мурмапя, каб растлумачыць ім дзеля чаго іх трымаюць у Расеі. (Роста)

Будучына Аустрыі.

„Фоссішэ Цайтунг“ піша, што паміж Францыяй і Італіяй пачаліся нялады у пытапні аб будучыня Аустрыі. Італія апирабуя далучэння нямецкай часткі Аустрыі да Нямеччыны, богэта памагая Італіі утрымаць за сабою паудніовыя часткі Аустрыі, населяпыя італьянцамі. Францускі урад, паадварот, баіцца узмацвення Нямеччыны і кіруяцца да адбудавання Аустрыі. (Роста)

Палякі ідуць на Бэрлін.

На сходзя Бэрлінскіх Салдацкіх Радау была атрымана вестка з Пазнані, што польская армія у ліку 20 тысячау чалавек ідзе на Бэрлін і ужо забрала цэлыпы рад мест. Нямецкая войска усюды адступая. Носкэ, народны упаунамочаны у справах абароны выслау насустрач палякам 5-ю дывізію. (Роста)

Магчымасьць сэрбска-італьянскае вайны.

Дэмабілізованыя сэрбы і словенцы ізноу прызваны у войско дзеля магчымай вайны з італьянцамі, якія, ня зважаючы на варункі замірэння, ня пакідаюць забраных імі славянскіх мяйсцовасьцяу. (Роста)

Чэска-Польская адносіны.

У палякау выходзяць нялады с чэхамі наконта пытання аб падзеля Сілезіі. Як павядамляя газэта „Цайт“, палякі гатуюцца да вайны с чэхамі. Адначасьня з гэтым Варшаускі урад паслау дапутацыю у Прагу дзеля спробау мірнаго уладжэння споркі. (Роста)

На барацьбу з бальшавікамі.

Паўнямаушыя у Варшаву беларуска-літоускія паны жалаюць аб утварэнні белае гвардыі дзеля барацьбы с бальшавізмам. Каб дастаць на гэта грошы, яны пазакладалі свае маіонткі. Варшаускія банкі пазычылі пад заклад панскае зямлі сорак міліонау. (Роста)

Амэрыка проціу французскіх захопных дамаганняу.

Як піша „Форвэртс“, Вільсон сказау амэрыканскім прадстаунікам у Парыжу, што Амэрыка ніколі ня дапусьціць анэксіі праваго берагу Рэйну. Нямеччына павінна астацца так, як яна іосьць. Зьмена граніцау можа адбыцца толькі згодна з воляю насялення. Вільсон выказвая пэунасьць, што хаурусьнікі ня пойдуць іншаю дарогаю. (Роста)

Баугарыя і Паудніова славянская дзяржава.

Як павядамляюць з Будапэшту, пацьвярджаяцца намерання Баугарыі далучыцца да Паудніова-славянскаэ дзяржавы. У Празя ідуць перагаворы аб гэтум пытанні паміж баугарамі і чэхамі. (Изв. Ц. И. К.)

Расстрэл дэлегацыі Чырвонаго Крыжа.

Польскі „соцыялістычны“ урад учыніу такі пізкі і зьверскі паступак, да якога, мусі быць, яшчэ ня дайходзіу жадны урад. Па яго прыказу расстраляна дэлегацыя Расейскаго Чырвонаго Крыжа, прыехаушая дзеля пярагаворау аб расейскіх палонных.

Што дзеяцца у Бэрліня.

Нямеччына цяпер пяражывая тоя, што пяражывала Расея у юлі месяцы 1917 году. Левыя соцыялісты—„спартакауцы“, нязадаволявыя палітыкаю соцыялістычна-згодвічаску урадаго Шэйдэмана-Эбэрта, пачалі паустаныя. Некольк дзіон на вуліцах Бэрліну адбываліся бітвы паміж паустаушымі і урадавымі войскамі. З абодвых бакоу карысталіся гарматамі і куляміотамі, а урадовыя войскі мелі нават самаліоты. Паустання задауляна.

Дэнікін хоча схаурусавацца з польскім урадам.

Да Варшавы прыехау гэнэрал Потоцкі, упоунаважаны гэнэралам Дэнікіным на вядзення пярагаворау з польскім урадам аб аб'яднанні Польшчы і казакау дзеля барацьбы з бальшавікамі. Потоцкі лічыць, што такая аб'яднання магчыма і будзя падтрымловацца хаурусьнікамі. (Роста).

Аб'яднання Чорнагоры с Сэрбіяй.

Украінская Талеграфная Агенства атрымала вестку, што Чорнагорская скупшчына адназдгодна пастанавіла скінуць караля Міколу і абвясьціла, што Чорнагорыя далучаяцца да Вялікай Сэрбіі пад кіраунцтвам каралеускаго роду Кара-Ягоравічау. (Изв. Ц. И. К.).

Фэрдынанд—Румынскі імпэратар.

У Румыні ідзе падгатоука к абвяшчэнню караля Фэрдынанда імпэратарам усіх румынау. Каранавання адбудзяцца посьля таго, як кароль верняцца да Букарэшту. Новы імпэратар будзя называцца Фэрдынанд Міхаіл II. Імя Міхаіла яму будзя дано затым, што румынскім нацыянальным сьвятым лічыцца Міхаіл Пабядзіцель. (Изв. Ц. И. К.).

Усясьветная рэвалюцыя расьце.

— У Паудзіопнум Кітаі рэвалюцыйны рух разрастаяцца. Банкі і мытпіцы (таможні) нацыяналізованы. Англія пастанавіла паслаць туды свае караблі і войско. Урад Пауночнаго Кітаю сьпешна пярапрауляя сваю войско з Маньчжурыі на полудзень.

— Італьянскі міністр грамадзянскае працы падауся у адстауку. Буржуазея дужа пяратрывожана блізасьцю рэвалюцыі. Дэмабілізацыя арміі ідзе надта туга.

— У Румыніі скрод дробнаго сялянства расьце рэвалюцыйны рух. Румынскі урад зьвярнууся да начальніка французскаго войска у Румыніі з прозьбай аб падмозя.

— У горадзя Вальпарайсо (у Паудзіоннуй Амэрыцы) пачалося агульная паустання. (РОСТА).

Редактор и Издатель:

Редакционная Коллегия.

ПАВЯДАМЛЕНЬНЯ.

Радакцыя газэты „Дзянніца“ с 10 января 1919 году пераведзяна на Прачысцянскі бульвар, дом № 29 квартэра 24. куды і належыць прысылаць усякую карэспанденцыю датычна радакцыі.

Радакцыя.

3-я Государственная типография (Р. С. Ф. С. Р.) Тверская, Мамоновский пер., д. 12.